Падтрымай "Вясну" на PATREON

Пераслед журналістаў "Белсата" працягваецца

20.04.2018 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Вольга Чайчыц. Фота belsat.eu

Карэспандэнтку "Белсата" **Вольгу Чайчыц** і аператара **Андрэя Козела** ў чарговы раз пакаралі штрафам за працу без акрэдытацыі.

Па інфармацыі "Белсата", суддзя Карэліцкага раённага суда **Ірына Каско** аштрафавала журналістаў па арт. 22.9 КаАП Рэспублікі Беларусь (парушэнне заканадаўства аб СМІ) на 40 базавых велічыняў кожнага (па 980 рублёў). Працэс адбыўся завочна, бо журналісты ў суд не з'явіліся.

Вольга Чайчыц патлумачыла прычыну:

> *«Не бачым сэнсу хадзіць на гэтыя паседжанні, калі рашэнне суд прымае загадзя і гэтае рашэнне палітычнае, калі нашыя паказанні нічога не значаць. Сэнс прысутнічаць ёсць толькі тады, калі мы можам нагадаць аб праблеме, якой прысвечаны сюжэт, за які нас судзяць».*

На гэты раз журналістку і аператара асудзілі за матэрыял пра супрацоўніка калгасу ў Карэліцкім раёне. Мужчына паскардзіўся на рабскія ўмовы працы ў СВК «Чарняхоўскі-Агра» і неўзабаве яго звольнілі.

Для Вольгі Чайчыц гэты суд стаў пятым за 2018 год, для Андруся Козела – трэцім. Да таго ж, за сюжэт пра датэрміновае галасаванне ў Бараўлянах падчас мясцовых выбараў іх паабяцалі даставіць прывадам і асудзіць, калі яны самі не з'явяцца ў суд.

Такім чынам, з пачатку года агульная сума штрафаў па арт. 22.9 КаАП Рэспублікі Беларусь (парушэнне заканадаўства аб СМІ) па стане на 20 красавіка складае **899** базавых велічыняў, альбо **9 390 еўра**.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў

рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY